# Святы Карло Акуціс

сл. Марыі Ючкавіч

муз. Ганны Шакола




1. Хлопец – праведнік Карло Акуціс,
Улюбёны бязмежна ў Хрыста,
Стаў вызнаўцам Яго славутым
Ты сусветна вядомым стаў.

*Святы апякун інтэрнэту,*
*Кароткім, пабожным жыццём*
*Уразіў ты нашу планету,*
*Табе сёння славу пяём.*

2. Ты – стваральнік вэб-сайта пра цуды,
Што здзяйсняў Хрыстус Пан на зямлі.
Твае справы для веры паўсюдна
Добрым прыкладам людзям былі.

3. Ты – Евангелля кібер-апостал,
Эўхарыстыю праз інтэрнэт
Сваёй працаю ўсім ты даносіў,
Каб Хрыста вызнаваў цэлы свет.

*Святы апякун інтэрнэту,*
*Кароткім, пабожным жыццём*
*Уразіў ты нашу планету,*
*Табе сёння славу пяём.*

4. У нашым бурным стагоддзі ты першы
Хто ў пятнаццаць гадоў стаў святым.
Святы Карло – наш сябра найлепшы.
Хай гучыць наша песня як гімн.

17.08.2025